
ЗГОДА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК
http://www.zgoda-weekly.org

№ 17 (245) 2–9 траўня 2002 г.

ПРИВАТИЗАЦИЯ

ВЫГОДА С ОГОВОРКАМИ



НАШ ВЕРНИСАЖ. «Белорусский вокзал», художник АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ-ДАЛЬ.

ТАТЬЯНА ПОПОВА

В последнее время аналитики все чаще говорят о подведении итогов развития белорусской экономики за годы независимости. По их мнению, кардинальные перемены близки. В особенности это касается разгосударствления собственности.

Белорусское государство разработало три сценария прощания с собственностью. Наиболее популярным стало преобразование предприятий в открытые акционерные общества. Такой выход из-под государственной опеки оказался приемлемым для 40,8 процента объектов. Пятую часть разгосударствленных компаний выкупили трудовые коллективы. Остальное приватизированное госдобро продавалось на аукционах. В областных городах в частные руки отдавали в основном предприятия торговли, общепита и бытового обслуживания. Чаще всего государство решалось на расставание с ними в связи с их малой рентабельностью и сравнительно небольшими денежными оборотами. Промышленность же государство до последнего времени держало в своих руках. Если бы не дороговизна убыточности этих предприятий для государственной казны, связанная, прежде всего, с необходимостью выполнять государственные планы, если бы не зависимость белорусских властей от предприимчивых российских бизнесменов, то и теперь о приватизации гигантов не могло бы идти речи.

Торговать промышленными предприятиями выгодно не меньше, чем оружием. Может, денег это приносит не так много, но зато доход можно не скрывать от граждан и тратить по назначению. Более того, продажу заводов можно преподнести как шаги к либерализации, которая предусматривает частную собственность. Не случайно основная активность чиновников, занимающихся вопросами денационализации, в прошлом году была направлена на реализацию чеков «Имущество» и наполнение бюджета доходами от приватизации предприятий. Проблема только в том, что и предприятия, и оружие когда-нибудь закончатся. И если советские запасы танков и снарядов Беларуси в общем-то ни к чему, то промышленный комплекс, несмотря на свою изношенность, все-таки необходим. Пока же понятие о продаже заводов иностранцам, чаще всего россиянам, подменяется разговорами о денационализации. Хотя на встрече с деловыми людьми страны осенью прошлого года Лукашенко заявлял о приоритете для национального инвестора, желающего вложить деньги в частное промышленное предприятие, самых лакомых для иностранного капитала компаний этот тезис не касается.

Дело в том, что законодательство уравнивает в правах белорусских и иностранных граждан, а также лиц без гражданства, когда разговор заходит об инвестициях. Департамент управления государственным имуществом при Министерстве экономики, который раньше был полноценным министерством, старается, тем не менее, выполнять указания своего президента. Следуя российскому примеру, оно считает возможным проведение закрытых аукционов «только для своих».

Фактически белорусские инвесторы поставлены в условия гораздо менее выгодные, чем их зарубежные коллеги. Предприниматели считают, что на первых порах на приватизированном предприятии работать становится сложнее, ведь государство предъявляет дополнительные требования к частникам. Особенно часто от них можно слышать нарекания по поводу налогового законодательства.

По словам Олега Мельникова, директора Департамента управления государственным имуществом при Министерстве экономики, многие руководители предприятий боятся реформирования и не видят схем управления предприятиями в новых условиях.

Да и путей приватизации не так много. Список предприятий, которые разрешается акционировать, формирует отраслевое министерство. Оно не желает расставаться с теми, кто приносит прибыль, и предлагает изменить форму собственности только убыточным и нерентабельным предприятиям. В нагрузку с каждым из объектов нередко предлагается сеть детских садиков, больниц и других социальных учреждений, от которых нельзя отказаться. Но самой актуальной проблемой остается несоответствие рыночной и оценочной стоимостей объектов продажи. Стремясь получить как можно больше денег, государственные оценщики называли такие цены за самые неказистые предприятия, что у новых владельцев почти не оставалось средств на полноценное развитие. И тем не менее, большинство руководителей приватизированных малых предприятий страны считают принятое решение о приватизации правильным.

Несколько лет назад действовала норма, позволявшая управленцам покупать до 5 процентов акций предприятия. Их, правда, нельзя было какое-то время продавать. Таким образом государство защищалось от высокой концентрации акций в одних руках. Но даже эти меры показались властям недостаточными. Теперь руководитель предприятия может приобретать акции наравне с остальными работниками. Сумма сделки не может превышать 100 минимальных зарплат. Перспективу приватизации на таких условиях директора не воспринимают как выгодное предложение, ведь они не получают никаких гарантий. Их в любой момент могут уволить. Но заинтересованность в акционировании предприятий распространена среди директоров. Если бы им предоставили льготы (не имеется в виду скупка акций у своих работников), то приватизация развивалась бы в Беларуси гораздо интенсивнее.

Лукашенко не раз повторял, что такой приватизации, как в России, он не допустит. Это вполне объяснимо. В соответствии с российским сценарием, для того, чтобы остаться независимым от тех, у кого есть деньги, белорусскому лидеру при-

Продолжение на стр. 3 ➲

Ï ÀÄÐÀÁß Ç ÏÀÑÜÖ²

Чарговыя зачысткі

Урад Генадзя Навіцкага толькі каля паўгоду папрацаваў без аргвывадаў. Акрамя міністра аховы здароўя Уладзіслава Астапенкі ў адстаўку адпраўленыя кіраўнікі дзяржаўных вытворчых канцэрнаў «Беллегпрам», «Белдзяржхарчпрам», «Беллеспаперапрам» і «Белбіяфарм».

Па словах старшыні Камітэту дзяржаўнага кантролю Анатоля Тозіка, гэтыя кіраўнікі звольненыя за невыкананьне прызначаных паказьнікаў. Што датычыць міністра Уладзіслава Астапенкі, то Лукашэнка проста выгнаў яго з памяшканьня, калі той ня змог адказаць, колькі прыватных структураў было выселена з больніц і паліклінік.


Лёс прэм'ера Генадзя Навіцкага будзе вырашаны пасьля таго, як стануць вядомыя эканамічныя вынікі другога кварталу. Аляксандар Лукашэнка не хаваў сваёй незадаволенасьці эканамічнай сытуацыяй у краіне. Шэсьць важнейшых паказьнікаў сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця ў першым квартале ня выкананыя, склады перапоўненыя нерэалізаванай прадукцыяй, якой сабралася на мільярд даляраў. Хранічнымі сталі запазычанасьці па заробках і пэнсыях. Жыцьцёвы ўзровень беларусаў няўхільна падае.

Па меркаваньню эканаміста Леаніда Злотнікава, на канец лютага пакупніцкая здольнасьць заробкаў упала ў сярэднім на 14 адсоткаў. У эканоміцы ёсьць адзін паказьнік – ці мы жывем лепш, ці горш. Дык вось, насельніцтва жыве ўсё горш і горш. Да канца году пакупніцкая здольнасьць заробкаў і пэнсый беларусаў упадзе яшчэ на 20 адсоткаў. Рэальнае становішча ў беларускай эканоміцы сапраўды крызыснае: многія прадпрыемствы стратныя, прастойваюць альбо працуюць няпоўны тыдзень. Але спробы выправіць сытуацыю шляхам звальненьня міністраў і кіраўнікоў вытворчых канцэрнаў нічога не прынясуць, бо няправільная стратэгія, што зыходзіць з самага верху, ад Аляксандра Лукашэнкі.

Тым часам прэм'ер Навіцкі прапанаваў для паляпшэньня сытуацыі комплекс захадаў, сярод якіх скарачэньне альбо нават забарона бартэру, зьмяншэньне затратаў на вытворчасць на 25-30 адсоткаў. Але для гэтага патрэбная зьмена тэхналёгіяў, на што няма ўласных сродкаў. Задача ж ураду сёлета – прыцягнуць у эканоміку краіны 400 мільёнаў даляраў замежных інвеЭстыцыяў – таксама невыканальная, пакуль атрымана толькі 16 мільёнаў.

Такім чынам, сытуацыя ў эканоміцы Беларусі не палепшыцца ні да канца другога кварталу, ні да канца году. ■

Памяці Ігара Герменчука



29 траўня журналісцкі свет абляцела сумная вестка: памёр Ігар Гермянчук. Не паверылі, тэлефанавалі адзін аднаму. Так нечакана, такі малады. Усяго 41 год. Яшчэ днямі бачыліся, увесь ў справах, згустак энергіі. Можа, чыйсьці няўдалы розыгрыш ці злая помста вальнадумцу, незалежнаму журналісту, непадкупнаму барацьбіту за свабоду.

На вялікі жаль, трагічная навіна аказалася жорсткай праўдай. Рак. Ён ведаў пра сваю невылечную хваробу. Нікому не казаў, паводзіў сябе і працаваў як заўседы, так што ніхто ні аб чым не здагадваўся. Якая мужнасць і якая воля!

І якая непапраўная страта. Не толькі для родных, блізкіх і сяброў. Для беларускай журналістыкі, для Беларусі.

Не многім дадзена адкрыць новую старонку ў гісторыі сваёй краіны. Ігар Гермянчук гэта здолеў зрабіць. Па сутнасці, з яго пачыналася беларуская незалежная прэса, імя якой было – газета «Свабода». Лідэр чытацкіх сімпатый. І, адпаведна, антыпатый прэзідэнцкай вертыкалі. "Свабода" не раз штрафавалася, забаранялася і зноўку, пад іншымі назвамі, аднаўлялася.

1999 год у дзейнасці Ігара Герменчука адзначаны яшчэ адным крокам першапраходца: ён распачынае выданне грамадска-палітычнага часопіса «Кур'ер». У нашых умовах – амаль непад'ёмная справа. Зноў барацьба, нервы, праца на знос. Звычайны рытм яго жыцця. Са студэнцкіх год у нацыянальна-дэмакратычным руху, дэпутат Вярхоўнага Савета 12-га склікання, сябра фракцыі Беларускага народнага фронта.

Непапраўна заўчасная, нелагічная смерць. Будзем жа верныя яго памяці. Не на словах, у справах.

Рэдакцыя газеты «Згода» прыносіць свае спачуванні жонцы і сыну Ігара Гермянчука, яго родным і блізкім.

АНЕКДОТ-С

Когда белорусы избирали Лукашенко, все было как в тоннеле. Впереди свет, к нему бежит электорат. После референдума 1995 года все стало как в цирке. Один говорит, все смеются. После референдума 1996 года стало как в трамвае. Кто-то сидит, большинство стоит, и все трясутся. После выборов 2001 года стало как в скучном кино. Все ждут конца сеанса, а уходить не хочется – жалко денег за билет.

***

В Беларуси разрабатывается новый проект административного кодекса. Нарушил один раз – прокол в паспорте. Нарушил два – второй прокол. Три нарушения – в графу «национальность» записывается «оппозиционер».

НАВІНЫ

Хвароба. Журналіст і мастак Мікалай Халезін з прычыны рэзкага пагаршэння стану здароўя позна ўвечары 28 красавіка вызвалены са спецпрыёмніка-размеркавальніка ГУУС Мінгарвыканкама. Халезін быў асуджаны на 15 сутак адміністратыўнага арышту за арганізацыю несанкцыянаванага маршу пратэсту «Так жыць нельга!». Увечары 28 красавіка стан здароўя спадара Халезіна рэзка пагоршыўся: ён пачаў задыхацца, не мог спаць. На просьбу хаця б ненадоўга выйсці на свежае паветра ахова адказала адмовай. Аднак праз некаторы час да зняволенага была выклікана «хуткая», якая адвезла яго ў першую клінічную бальніцу Мінску. Пасля дадатковага абследавання лекары рэкамендавалі Халезіну амбулаторнае лячэнне, заявіўшы, што ўтрымліваць яго ва ўмовах спецпрыёмніка-размеркавальніка нельга. Цяпер Халезіну прапісаны пасцельны рэжым.

Крэдыт. Адкрытаму акцыянернаму таварыству «Белмедпрэпараты» будзе выдаткавана бюджэтная пазыка ў памеры 400 мільёнаў рублёў. Сродкі накіроўваюцца з мэтай фінансавага аздараўлення акцыянернага таварыства, а таксама забеспячэння насельніцтва і лекава-прафілактычных установаў Беларусі лекамі і пашырэння іх вытворчасці. Вяртанне пазыкі павінна быць зроблена з 1 студзеня да 30 чэрвеня 2003 года штомесяц роўнымі долямі. Міністэрству фінансаў Беларусі даручана заключыць ва ўстаноўленым парадку з ААТ «Белмедпрэпараты» дагавор аб умовах выдачы і вяртання названай пазыкі.

Парада. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі прапанавалі кіраўніцтву Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы перанесці семінар па праблемах нармалізацыі адносінаў ПАРЕ з Беларуссю з Вільні ў Мінск. На гэтым семінары, які адбудзецца ў чэрвені, плануецца абмеркаваць пытанні адмены пакарання смерцю ў Беларусі, пашырэння паўнамоцтваў беларускага парламенту, новую рэдакцыю закону аб СМІ і шэраг іншых пытанняў.

Пошліны. Савет міністраў Беларусі ўстанавіў сезонныя пошліны на цукар, які будзе завозіцца ў Беларусь сёлета з 1 верасня. Стаўка пошліны на цукар складзе 50 працэнтаў ад мытнага кошту, але не меней за 0,18 еўра за кілаграм. Сезонныя пошліны ўстанаўліваюцца тэрмінам на 6 месяцаў. Гэта робіцца ў адпаведнасці з законам «Аб мытным тарыфе» і ў мэтах забеспячэння стабільнага развіцця арганізацый цукровай галіны.

Саюз. Чарговае паседжанне Савета міністраў Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі адбудзецца 4 чэрвеня. Месца правядзення паседжання саюзнага ўраду пакуль не вызначана. На паседжанні Савета міністраў плануецца абмеркаваць выкананне планаваных на 2002 год мерапрыемстваў па развіцці Саюзнай дзяржавы, працу над Канстытуцыйным актам, справаздачу пра выкананне бюджэту міждзяржаўнага ўтварэння за 2001 год, статут тэлерадыёвяшчальнай арганізацыі Саюзнай дзяржавы, а таксама заслухаць справаздачу міністэрстваў інфармацыі і друку дзвюх краінаў пра тое, як распрацоўваецца праграма «Забеспячэнне адзінай інфармацыйнай прасторы Саюзнай дзяржавы».

Прафсаюзы. 33 працэнты мінчукоў не падтрымліваюць дзейнасць уладаў, скіраваных на стварэнне прафсаюзных структур, якія будуць супрацьстаяць арганізацыям Федэрацыі прафсаюзаў Беларускай. Разам з тым, 14 працэнтаў рэспандэнтаў, наадварот, гэткія захады ўхваляюць. Такія вынікі апытання, праведзенага 22–25 красавіка супрацоўнікамі сацыялагічнай службы «Люстэрка» інфармацыйнай кампаніі БелаПАН сярод 500 жыхароў беларускай сталіцы ад 18 гадоў і вышэй. 23 адсоткам апытаных усё роўна, што адбываецца з прафсаюзамі.

Пенсіі. Ад чатырох да дзесяці дзён складаюць затрымкі па выплатах пенсій у Брэсцкай вобласці. У сакавіку своечасова не атрымалі пенсіі 64 тысячы чалавек, у красавіку сітуацыя па выплатах не палепшылася. У гарадах выплата пенсій запазнялася ў сярэднім на чатыры дні, у сельскіх раёнах – на 8–10 дзён. Адна з прычын – парушэнне суб'ектамі гаспадарання заканадаўства па выплаце абавязковых страхавых плацяжоў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва.

Канфлікт. Пад пагрозаю закрыцця аказалася Беларуская каталіцкая місія ў Лондане. З 1947 года місія была сядзібаю нацыянальных і дабрачынных арганізацый беларусаў Вялікабрытаніі. З пачатку 1970-х тут існуе бібліятэка Францішка Скарыны – найбольшы за межамі Беларусі збор беларускай і беларусазнаўчай літаратуры. Цэнтр беларускай місіі – Дом марыянаў (*Marian House*). Гэты будынак быў набыты на ахвяраванні беларусаў усяго свету. У выніку маніпуляцыяў і насуперак волі ахвярадаўцаў, ён перайшоў ва ўласнасць структураў каталіцкай царквы. Цяпер Кангрэгацыя ўсходніх цэркваў, якая заяўляе правы на Дом марыянаў, патрабуе высялення з яго беларускай місіі і царквы.

Падручнікі. У Беларусі абвешчаны адкрыты конкурс на стварэнне падручнікаў сацыяльна-гуманітарнай сферы для агульнаадукацыйных школаў. Над гэтым працуюць 19 аўтарскіх калектываў, заяўкі якіх знаходзяцца на кантролі ў кіраўніка дзяржавы. У траўні будзе праведзеная экспертыза працы аўтарскіх калектываў. Да ранейшых падручнікаў выстаўляюцца прэтэнзіі: перагружанасць зместу, дрэнны выклад тэарэтычнага матэрыялу, кепская мова і стыль падачы матэрыялу.

Марафон. У горадзе Крычаве Магілёўскай вобласці 28 красавіка прайшоў дабрачынны марафон на карысць хворых дзяцей «З надзеяй у будучыню». Марафон у Крычаве арганізавалі раённыя ўлады і таварыства Чырвонага Крыжа. Грошы збіралі для трох хворых дзяцей. Напярэдадні марафону сярод жыхароў Крычава была распаўсюджаная тысяча дабрачынных квіткоў па тысячы рублёў кожны. Акрамя гэтага, пералічэнні грошай на спецыяльны рахунак зрабілі прамысловыя прадпрыемствы, прыватныя прадпрымальнікі і фінансавыя арганізацыі.

ХИТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ



«На коленях к солигорской валюте пробирались депутаты»

(В. Быченя, «Народная газета», 30.04.02)



«Минский подшипниковый завод объявил войну бартеру одним из первых»

(Н. Лазарева, «Советская Белоруссия», 30.04.02)



«Журналист имеет право на домыслы, иначе не интересно было бы читать прессу»

(А. Милькота, пресс-конференция, 30.04.02)

КАМУНАЛКА

Плаціць давядзецца болей

ТАЦЬЦЯНА ПАПОВА

Нягледзячы на тое, што ацяпляльны сэзон даўно скончыўся, міністар жыльлёва-камунальнае гаспадаркі выбраўся да журналістаў толькі 30 красавіка. Перадусім ён выказаў задаволенасьць тым, як ягоная каманда абагравала беларускіх насельнікаў.

Доказам сваіх працоўных посьпехаў Аляксандар Мількота прапанаваў лічыць сваю прысутнасьць на сустрэчы. Міністар хваліўся, што для выкананьня пляну яму давялося задзейнічаць усе паліўныя рэсурсы. Акрамя традыцыйнага вугалю ды мазуту дарэчы прыйшліся дровы.

Бяз скаргаў не абышлося. Манапаліст на рынку камунальных паслуг у адказ на скаргі заявіў, што ён – за здаровую канкурэнцыю, і прапанаваў незадаволеным працай міністэрства аб'ядноўвацца ў таварыствы й адмяжоўвацца ад дзяржаўных службаў. Па яго-ных словах, у Мінску ўжо створана каля 80 такіх аб'яднаньняў. Аднак тое, што жыльлёва-камунальныя службы губляюць кліентаў, не насьцярожвае міністра.

У яго цяпер іншы галаўны боль. Грамадзяне досыць сумленна плацяць міністэрству. У іх толькі 5 мільярдаў *BYR* запазычанасьці перад жыльлёва-камунальнай установай. А вось дзяржава не выконвае сваіх абавязкаў, у выніку чаго міністэрства не атрымала 37 мільярдаў *BYR*. Што да прамысловасьці на дзяржразьліку й іншых прадпрыемстваў на бюджэтным балянсе, дык іх агульная запазычанасьць перавышае 120 мільярдаў рублёў. Каб выправіць сытуацыю, кардынальныя меры прымаюцца толькі ў дачыненьні да дырэкцыяў і кіраваньняў.

У бальшыні насельніцтва выклікала шмат нараканьняў ня столькі якасьць абслугоўваньня, колькі неабходнасьць з кожным месяцам плаціць за паслугі ўсё больш і больш. У адпаведнасьці з законам аб бюджэце, кожны кліент жыльлёва-камунальнае службы павінен зь першага студзеня гэтага году плаціць сорак адсоткаў ад поўнае тарыфнае стаўкі. Яшчэ столькі ж павінна паступаць зь бюджэту. 11 адсоткаў кошту паслуг для насельнікаў дагэтуль пагашаецца праз перакрыжаваныя субсыдыі і 9 – з арэндных даходаў міністэрскіх структур.

Чынавенства, не жадаючы пужаць людзей адразу пасьля зімовых сьвятаў, пагадзілася на тое, каб яны плацілі 30,8 адсотка ад поўнага кошту камунальных паслуг. Аднак законы, хаця б некаторыя, неабходна выконваць. Таму цягам году стаўка для насельнікаў уздымецца да 47,6 адсотка. І гэта толькі кветачкі. З наступнага году спажыўцы гарачае вады й цеплыні павінны будуць пагашаць дзьве трацiны ад іх поўнага кошту, яшчэ праз год палёгка для іх будзе складаць толькі пятую частку. Аб далейшых зьмяненьнях тарыфнае сеткі ў жылкамгасе пакуль ня думалі.

У мінулым годзе ў Менску гарачую ваду адлучалі толькі на два тыдні. Народу такія тэрміны вельмі спадабалася. Аднак у гэтым годзе на іх разьлічваць ня варта. Мількота кажа, што такі кароткі тэрмін прафіляктыкі эканамічна нявыгадны. Сваіх разьлікаў Мількота не прадставіў, але ўпэўнена заявіў: "*Калі чалавек хоча памыцца, ён заўжды знойдзе, дзе зьдзейсьніць гэтую апэрацыю*". ■

СЬВЯТАТАЦТВА

Пад адкрытым небам

АНТОСЬ САКОВІЧ

У ноч з 28 на 29 красавіка невядомыя вандалы спалілі каплічку на ўскрайку Менску, каля вёскі Кунцаўшчына.



Першая спроба падпалу й разбурэньня каплічкі адбылася яшчэ на каталіцкі Вялікдзень. Але тады ў вандалаў нічога не атрымалася. Яны вярнуліся праз месяц і давершылі сваё сьвятатацтва.

Зараз на ўзгорку засталіся толькі рэшткі вагончыку, перабробленага ў каплічку, якія ўдалося выратаваць пажарным. Нягледзячы на тое, што месца знаходзіцца ў колькі сотняў мэтраў ад будуемай станцыі мэтро "Чырвоны бор", гэта ўжо ня Менск, а Менскі раён. Таму рассьледваньне павінна праводзіць раённая міліцыя. На тэлефанаваньне старшыні касьцёльнага камітэту з паведамленьнем аб злачынстве дзяжурны міліцыянт адказаў, што машына выехаць ня можа, бо няма бэнзыну.

Менш за год таму, 9 чэрвеня 2001 году, ксёндз-біскуп Кірыл Клімовіч асьвяціў пастаўлены крыж і само месца, якое было выдзелена каталікам на пабудову касьцёлу Маці Божай Будслаўскай. На ўрачыстасьць сабралося больш за трыста вернікаў.

Паколькі ўзьвядзеньне храму вымагае вялікіх грошаў і часу, на невялічкім узгорку каля вёскі Кунцаўшчына паставілі часовую каплічку. Штонядзелю там зьбіраліся мясцовыя каталікі. Імшу служыў пробашч парафіі сьв. Сымона й Алены (што месьціцца ў Чырвоным касьцёле) ксёндз-магістр Уладзіслаў Завальнюк. Летась тут нават прайшла першая камунія для дзетак.

У гэтым годзе другая група дзяцей таксама рыхтавалася да першага ў жыцьці сакраманту камуніі. Але, відаць, ім прыйдзецца пачакаць. Праводзіць зараз імшу ў гэтым месцы немагчыма. Вернікі засталіся пад адкрытым небам. ■

АДУКАЦЫЯ

Лепш ня ведаць

З гэтага навучальнага году рашэньнем міністра адукацыі сп. Брыгадзіна выпускнікі сярэдніх школаў будуць мець усяго два абавязковыя пісьмовыя іспыты: па матэматыцы й мове — на выбар — расейскай альбо беларускай.

Абавязковы з 30-х гадоў мінулага стагоддзя вусны іспыт па беларускай літаратуры зараз будуць здаваць толькі добраахвотнікі. Гэтае рашэньне не такое бяскрыўднае, як здаецца на першы погляд, бо прынятае яно адначасова з рэзкім скарачэньнем колькасьці гадзінаў на вывучэньне роднае літаратуры. Сумарна з чацьвёртае да адзінаццатае клясы колькасьць іх скарачаецца на сем урокаў штотыднёва. Тлумачыцца рашэньне неабходнасьцю разгрузкі школьнікаў, аднак колькасьць прадметаў прыродазнаўчага цыклю застаецца ранейшаю. Вось як пракамэнтаваў рашэньні міністэрства намесьнік дырэктара Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа Лявон Баршчэўскі: «*У школах з расейскай мовай навучаньня, а ў іх навучаецца пераважная бальшыня школьнікаў, фактычна зьнікае апошні стымул вучыцца гаварыць па-беларуску. Такім стымулам быў абавязковы іспыт, да якога трэба было рыхтавацца: вучыць вершы на памяць, рыхтаваць вусныя выказваньні па характарыстыцы твораў, эпохаў іх напісаньня й да таго падобнае. Усё гэта зьнікае. Фактычна ідзе вяртаньне ў стан 1960-х гадоў, калі беларускую літаратуру вучні адказвалі па-расейску. Цяпер у настаўнікаў ня будзе ніякіх аргумэнтаў, каб змусіць вучняў адказваць гэты прадмет па-беларуску. Што прывядзе да татальнага выцясненьня са школы беларускае вуснае мовы, яна застанецца толькі ў пісьмовым выглядзе*".

Зь ліку абавязковых зьнікла й гісторыя Беларусі. Гэта таксама вельмі насьцярожвае. Асабліва калі ўзгадаць пільную ўвагу з боку прэзыдэнта да падручнікаў па айчаннай гісторыі, зь якіх зараз імкнуцца крэсьліць любы напамін пра нацыянальную барацьбу беларусаў з Расейскай імперыяй. Такім чынам, праз некалькі год мы маем ўсе шанцы атрымаць маладое пакаленьне, якое, у сваёй большасьці, ня толькі ня будзе ведаць найвыдатнейшых твораў беларускай гісторыі, але й забудзецца на сваю нацыянальную гісторыю. ■

ПРИКЛАДНАЯ СОЦИОЛОГИЯ

С дуба падают листья ясеня

АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ

Национальный опрос общественного мнения, проведенный НИСЭПИ в апреле текущего года, дал весьма любопытные результаты. Из 1464 опрошенных (ошибка выборки не превысила 0,03 процента) только 32,4 процента доверяют президенту Лукашенко. А избирателей, готовых за него голосовать на новых президентских выборах, и того меньше. До 30,9 процента сузилась твердая электоральная база белорусского президента.

Нет нужды гадать, к каким мерам прибегнет Александр Лукашенко, чтобы укрепить пошатнувшуюся популярность. Хотя он является всебелорусским чемпионом по поднятию собственного рейтинга, ему вряд ли суждено побить свои старые рекорды.

Прежние спортивно-популистские достижения белорусского президента, безусловно, впечатляют. Но теперь против нашего чемпиона работает его политический возраст. Сказывается и отсутствие серьезных конкурентов из оппозиции. Но главным слабым местом Александра Лукашенко становится скудный комплект технических средств, оставшихся в его распоряжении.

Можно опять *«перетрахивать»* чиновников. Кстати, глава белорусского государства уже начал это делать. Три государственных концерна и Минздрав скоропостижно обезглавлены. На очереди премьер Новицкий и его замы.

Уже не помогают Александру Лукашенко поездки по регионам, где верноподданное народонаселение может прикоснуться к лучезарному имиджу власти предержащей. Поскольку всем остальным до президентской лучезарности в лучшем случае нет никакого дела.

Чрезвычайно раздражает вчерашних поклонников Лукашенко и то, как он однообразно гундосит по радио и на БТ. Если пропагандистский супчик постоянно подогревать, то он становится очень невкусным. Теряется острота восприятия, а неизменный набор популистских дурилок вызывает лишь тошноту.

Отнюдь не случайно вместе с популярностью президента Лукашенко падает индекс доверия и к его средствам массовой информации. Согласно данным апрельского опроса НИСЭПИ, теперь только 38,7 процента респондентов доверяют государственным СМИ. Зато 43,1 процента считают неостоверной всю информацию, тиражируемую президентскими официозами.

Также постоянно утрачивают доверие белорусов и прочие государственные институты. Центральной избирательной комиссии сейчас не доверяют 47,7 процента; КГБ – 46,9; судам – 50,6; Совмину – 52,3; Нацсобранию – 52,0; местным органам власти – 61,3.

Самым одиозным государственным институтом по-прежнему является милиция. 61,7 процента опрошенных не доверяют хранителям президентского правопорядка. Зато белорусская армия, стоящая вне лукашенковской политики, пользуется абсолютным благорасположением граждан. Не доверяющих армии насчитывается всего лишь 31,6 процента.

Вполне возможно, что на армию возлагаются особые надежды. Так, 29,8 процента респондентов НИСЭПИ опасаются войны с другими странами.

Страхи и опасения белорусов заслуживают отдельного рассмотрения. Меньше всего тех, кто боится, что Россия или Запад скупят на корню белорусскую собственность. Таковых всего 8,9 и 7,7 процента соответственно.

А вот тем, что в ближайшем будущем продукты питания и товары первой необходимости станут недоступны из-за роста цен, напуганы 54,1 процента опрошенных. Здесь же 43,1 процента страшатся того, что им будет невозможно оплачивать коммунальные услуги из-за роста цен. Вместе с тем лишь 18,8 процента опасаются потери денежных сбережений. Поскольку для остального большинства доллар в личном чулке хранится намного надежнее, чем зайчики-домики в банках, контролируемых этим государством.

Большинство с опаской относится к экономическому дирижизму президента Лукашенко. Значительно и число тех, кого не радуют возможные крутые меры по наведению порядка в экономике. 30,3 процента респондентов НИСЭПИ в ближайшем будущем опасаются установления некоей диктатуры. Едва ли они рассматривают иную, чем Александр Лукашенко, кандидатуру на роль всебелорусского диктатора.

Как бы чего не вышло плохого. Поэтому из стана противников Лукашенко 64,5 процента опасаются открыто выражать свои политические взгляды. В противоположном лагере сторонников белорусского президента того же самого боятся 45,4 процента. А предчувствие гражданской войны не дает покоя 19,9 процента белорусских граждан, опрошенных НИСЭПИ.

На основании только одного опроса не стоит делать скороспелых умозаключений. Дескать, близок конец вечного белорусского президента. Пока несомненно одно: после переизбрания на новый президентский срок Александр Лукашенко продолжает наступать на старые политические грабли. Что из этого получится? Поживем – увидим. Если выживем. ■



ПРИВАТИЗАЦИЯ

ВЫГОДА С ОГОВОРКАМИ

Окончание. Начало на стр. 1

шлось бы запастись не меньшим капиталом, то есть стать одним из олигархов. Это, однако, подорвало бы его авторитет среди пенсионеров и прочего взращенного по советским правилам населения. Ведь бабушки и их мужья любят батьку в том числе и за то, что он *«никогда не был ворюгой, никогда чужого не брал»*. Президентская бедность очень импонирует гражданам, для которых это единственное оправдание их собственной нищеты.

Сделки с российскими деловыми людьми уже не единственно верная перспектива для белорусского руководства, даже не завтрашний день. Это – настоящее. По мнению президента аналитического центра «Стратегия» Леонида Заико, приватизация в Беларуси отличается от аналогичных процессов в странах-соседках только отставанием во времени и отсутствием правдивой информации для широкой общественности. Схема такова: представители высшей государственной власти договариваются с российским олигархом о том, что продают предприятие за определенную сумму. Олигарх соглашается заплатить в государственную казну только часть от названной стоимости и положить несколько миллионов долларов на личный счет чиновника в швейцарском банке. Таким образом, и покупатель экономит, и продавец в выигрыше. Леонид Заико предполагает и другой вариант. В обмен на выгодные условия сделки олигарх предлагает назначить на руководящую должность сына продавца, снабдив его увесистым пакетом акций.

Российские бизнесмены не засекречивают своих расчетов. Если их условия не будут приняты сейчас, то через пару лет уже не предприятия будут устраивать тендеры среди потенциальных владельцев, а бизнесмены снисходительно перебирать нищие предприятия. Уже сейчас доля убыточных и оказавшихся под угрозой банкротства предприятий растет, отраслевые министерства не проводят системной диагностики и анализа платежеспособности подведомственных предприятий. Несмотря на интерес инвесторов, им не предлагают даже тех предприятий, которые не смогут работать уже завтра. Никто не контролирует своевременность возврата или преобразования арендованного имущества арендными компаниями. Сейчас доминирующим условием приватизации является инициатива трудовых коллективов. Но нежелание работников связывать свою жизнь с нищим предприятием, которое в долгах как в шелках, не повод для того, чтобы не исправлять ситуацию. Интерес к компании появляется у народа именно в годы ее процветания. Поэтому от инвесторских предложений не стоит отмахиваться, ожидая, пока народ созреет.

Многие белорусские граждане, даже уволенные с государственного предприятия и попытавшиеся устроиться у частных работодателей, вспоминают госслужбу с ностальгией. Они по-прежнему надеются, что когда-нибудь им повезет с работой, где платят за время, проведенное на рабочем месте, а не за работу.

Поменять массовое сознание белорусских граждан не достаточно для того, чтобы изменить приватизационную политику. Стоит пересмотреть множество законов, подумать о частной собственности на землю. А пока выгоду от приватизации получают лишь те, кто благодаря своим полномочиям распоряжается государственным имуществом. ■

ПАРТНЕРСТВО

ЛЕД ТРОНУЛСЯ

АЛЕКСАНДР КАВАЛЬСКИЙ

***«29 апреля 2002 года Александр Лукашенко потерял монополию на развитие белорусско-российских отношений. С сегодняшнего дня у него нет контрольного пакета в этой теме»*, — заявил Анатолий Лебедько на подписании документа «Россия — Беларусь: правый взгляд» между белорусской ОГП и российским СПС.**

Как сказал бы Карлсон, случилось чудо: друг нашел друга. Впервые в постсоветской истории белорусские и российские демократы подписали документ, регламентирующий их сотрудничество и долговременное партнерство. Кроме того, наконец-таки был сформулирован совместный альтернативный взгляд на российско-белорусскую интеграцию – так называемый «правый взгляд» на союз. Патриотов, шарахающихся от слова «интеграция», один из лидеров Союза правых сил Борис Немцов успокоил: *«Пафос «правого взгляда» на интеграцию – крепко взявшись за руки прорываться в Европу»*. Анатолий Лебедько добавил: *«Мы не ведем нас назад в Советский Союз, а к тем ценностям, которые разделяем и мы, и СПС»*.

Объединенная гражданская партия стала первой в Беларуси политической силой, осознавшей необходимость отказа от застарелых фобий, связанных с Россией и рукой Москвы. Ущербность однобокой ориентации на Запад со всей очевидностью проявилась на президентских выборах. Оказалось, что российские политики и чиновники весьма скромно информированы о нашей внутренней ситуации и по-прежнему находятся под воздействием старого мифа о том, что у нас есть только одна сила, выступающая за дружбу с Россией, – президент. *«Пусть он и сукин сын, но наш сукин сын»*, – вот примерная логика Москвы. Но самое интересное заключается в том, что наша демократическая оппозиция нисколько не постаралась разуверить Кремль в этом, старательно подыгрывая Лукашенко в борьбе за расположение Путина. ОГП такая проигрышная стратегия, кажется, уже надоела. Лед тронулся. Кто следующий?

Подписание концепции «Беларусь – Россия: правый взгляд» анонсировалось еще в конце прошлого года и планировалось на февраль. Но согласование 5-страничного документа заняло несколько месяцев. В преамбуле к концепции правые констатируют, что в сегодняшней форме союз *«выгоден преимущественно контрабандистам и бюрократам»*. Либералы же предлагают *«долгосрочное, полномасштабное и взаимовыгодное сотрудничество»*, целью которого станет совместное будущее в свободной и демократической Европе *«без границ для национальных культур, людей, товаров и денег»*.

Далее документ структурирован на части: правый взгляд на государство, безопасность, экономику, социальную помощь, глобализацию, самоуправление и, наконец, сам союз Беларуси и России. Самый странный для либералов взгляд оказался на безопасность. Чего только стоит фраза: *«Армия для правых – важнейший институт государства. Профессии солдата и офицера должны стать самыми престижными и почетными в обществе»*? А как насчет профессий врача или школьного учителя? Также удивляет пассаж о том, что *«Россия и Беларусь тесно координируют деятельность своих структур по обеспечению коллективной безопасности»*. Но это, пожалуй, единственный явный прогиб, сделанный ОГП ради налаживания сотрудничества с СПС. Надо понимать, что для российских правых тема армии, особенно сейчас, когда они лоббируют принятие своей концепции военной реформы, крайне важна. *«Россия без армии – это не Россия»*, – добавил Борис Немцов на пресс-конференции.

Лучше всего описаны и обоснованы экономические разделы. Правые поддерживают процесс глобализации и считают, что экономическая интеграция наших стран – это и есть проявление региональной глобализации. Причем интеграция должна проходить в условиях полной либерализации, открытости наших экономик. Первый этап подразумевает ликвидацию тарифных барьеров на пути импорта-экспорта, введение запрета на дефицит бюджетов всех уровней в двух странах, отказ от административного регулирования цен, проведение широкомасштабной приватизации и синхронизацию монетарной политики.

Одновременно с этим правые не видят необходимости в едином эмиссионном центре для Беларуси и России, а также собираются заштопать таможенные дыры на границе между двумя странами. Россияне совсем не настаивают на эксклюзиве при приватизации нашей промышленности. По мнению ОГП и СПС, *«фундаментальным правилом продажи государственной собственности в Беларуси является гарантирование равных условий для всех инвесторов, вне зависимости от страны происхождения и формы собственности»*. Предпосылкой для проведения этих системных экономических реформ являются реформы политические: проведение честных выборов по стандартам и нормам, принятым в ОБСЕ и Совете Европы, соблюдение принципа разделения властей.



Второй этап интеграции – это создание реального таможенного союза между нашими государствами по параметрам, максимально совпадающим с параметрами аналогичных международных структур. На этом этапе придется синхронизировать также и фискальную политику, а наши валюты будут легализованы как параллельное платежное средство на территории союза. Каждая из стран также вправе легализовать хождение у себя доллара и евро в качестве подготовки ко вступлению в ЕС. Вступление в Европейский Союз – последний, третий этап интеграции: *«Граждане России и Беларуси должны стать полноправными участниками единой Европы»*.

Правый взгляд на союз, конечно, не является официальной позицией России. Тем не менее, вряд ли стоит и преуменьшать значение и силу влияния СПС на В. Путина. Другого интеллектуального ресурса у Кремля просто нет («Единство» – это всего лишь машина для правильного голосования). По словам Бориса Немцова, то, что записано в концепции, на 90 процентов *«не публично, может быть, но по сути будет поддержано Кремлем»*.

Пока же лидер СПС как минимум пообещал передать российскому президенту письмо родственников Г. Карпенко, Ю. Захаренко, В. Гончара, А. Красовского и Д. Завадского. Жены пропавших и погибших белорусов просят В. Путина при личной встрече с белорусским президентом задать ему вопрос о судьбе их мужей. Кроме того, во исполнение Соглашения о сотрудничестве с ОГП лидер Союза правых сил будет добиваться проведения парламентских слушаний в Госдуме по вопросу исчезновения политических оппонентов режима в Беларуси. ■


НОВОСТИ СНГ



Украина. Накануне Пасхи на Украине обострились противоречия между православной церковью Киевского патриархата и православной церковью Московского патриархата. Первые обвинили вторых в «разбойном нападении» на строителей храма Вознесения Господня в поселке Благодатном на Киевщине. Храм возводится на средства Киевского патриархата. Несколько дней назад, ночью, примерно 15 человек, вооруженных дубинками и металлическими прутьями, вбежали в общежитие, где живут строители, и жестоко избили их. При этом нападавшие угрожали убийством, если строители не уедут из Благодатного. По мнению Высшего церковного совета Киевского патриархата (КП), эту акцию организовал священник Украинской православной церкви, входящей в Московский патриархат, отец Валерий совместно с криминальными элементами. Как следует из слов руководства КП, во время церковных служб отец Валерий даже подстрекает своих прихожан отнять у Киевского патриархата недостроенный храм.

Армения. Завидную фантазию проявляют армянские оппозиционеры. Недавно президент страны Роберт Кочарян закрыл последний независимый телеканал «А1+». Оппозиция вывела на улицы возмущенный народ. 26 апреля на очередном, четвертом по счету, митинге в защиту свободы слова, на одной из ереванских площадей был вывешен большой телевизионный экран и показан информационный блок телекомпании «А1+». *«Если каждую неделю вместо митингов и шествий станут показывать на площади новости, то резонанс от этого будет в несколько раз сильнее и приведет на площадь еще больше народу»*, – так прокомментировал происходящее главный редактор интернет-издания «Открытые страницы» Ваан Ишханян. Еще одно ноу-хау армянских оппозиционеров привело к отключению службы, при помощи которой передаются текстовые сообщения на сотовые телефоны (*SMS*). Это было сделано после того, как за день до третьего митинга «доброжелатели» оповестили всех владельцев сотовых телефонов о предстоящем митинге. А 26 апреля, начиная с полудня, была парализована вся сотовая связь Еревана. *«Зачем поднимать шум, пусть спор решит суд. Хотя, на мой взгляд, нарушения закона здесь я не вижу»*, – выразился по поводу оппозиционной бучи сам президент Кочарян. Правда, он забыл упомянуть, что судьи в Армении напрямую зависят от Совета Правосудия, органа, который возглавляет (кто бы мог подумать?) сам Роберт Кочарян.

